грамадская кампанія

# Наш FарMат

# ЗА БЕЛАРУСКУЮ МОВУ НА АЙЧЫННЫМ FM!

**Вы трымаеце ў руках інфармацыйную ўлётку грамадскай кампаніі “Наш FарMат”.**

**Сваёй мэтай мы абвяшчаем рэальнае павелічэнне аб’ёму роднай мовы ў эфіры айчыннага радыё. Сёння, за выключэннем Першага нацыянальнага канала радыё і “Авторадио”, беларуская мова фактычна не гучыць на FM- частотах. 75% квота на беларускую музыку – чарговы дзяржаўны блеф, паколькі не прадугледжвае ў сабе менавіта моўных патрабаванняў. Нам тыкаюць стваральнікі гэтай квоты на Францыю, дзе на радыё 60% вяшчання – нацыянальнае, але не тлумачаць пры гэтым, што канкрэтна столькі праграм павінна быць на французскай мове. А тым больш маўчаць пра дзейнасць “моўнай паліцыі”, якая строга кантралюе гэты адсотак.**

**Фіксаваныя квоты выкарыстання роднай мовы для радыёэфіру дзейнічаюць у суседзяў: Украіне ды Літве. А вось беларусам “падсунулі” квоту на псеўдабеларускасць на радыёканалах. Толькі супольная воля грамадства можа змяніць становішча. І таму пазіцыя кожнага з Вас можа дапамагчы ў вырашэнні гэтай праблемы. Далучайцеся да грамадскай кампаніі “За беларускую мову на айчынным FM”!**

**Як і што рабіць? Звяртайцеся на афіцыйны сайт nashfarmat.org, дзе Вы знойдзеце падрабязную інфармацыю пра кампанію, меркаванні айчынных і замежных экспертаў, вынікі маніторынгаў дзейнасці шоў-бізнесу і радыёстанцый Беларусі, а таксама канкрэтныя парады і прапановы.**

# Вы можаце стаць валанцёрам кампаніі і дапамагаць нам:

— Пісаць лісты, тэлефанаваць ў адпаведныя дзяржаўныя органы, звяртацца на радыё з просьбай павялічыць ужытак беларускай мовы;
— Уздымаць праблему ў СМІ Вашага рэгіёна і ў агульнарэспубліканскіх медыя;
— Збіраць подпісы пад Зваротам увядзення фіксаванай квоты ўжытку беларускай мовы ў эфіры айчыннага FM;
— Арганізаваць у Вашым населеным пункце альбо навучальнай установе групы грамадзянаў, якія будуць пашыраць ідэі кампаніі на лакальным узроўні;
— Аптымізоўваць сайт кампаніі і тэматычныя суполкі ў сацыяльных сетках: дадаваць навіны, ставіць інтэрв'ю, здымаць і размяшчаць тэматычныя відэаролікі і г.д.
— Ладзіць тэматычныя флэш-мобы і перфомансы.
— Арганізоўваць сустрэчы і дыскусійныя пляцоўкі па існуючай праблеме.

## Нашы кантакты:


nashfarmat.org - афіцыйны сайт кампаніі;

nashfarmat.livejournal.com - афіцыйная суполка ў LJ;

http://vkontakte.ru/club11332134 - афіцыйная суполка В Контакте;

nashfarmat@gmail.com - электронны паштовы адрас;

220007, г. Мінск, а/с 48 - адрас для папяровай пошты

twitter: http://twitter.com/nashfarmat


# ЗМЕНІМ
# фармат айчыннага радыё
# РАЗАМ!